## А. М. Янушкевіч, *Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558-1570 гг.*, Мінск 2007, сс. 356. Наклад 300 асобнікаў.

Манаграфія менскага гісторыка Андрэя Янушкевіча — першае ў айчыннай гістарыяграфіі дасьледаваньне, прысьвечанае аднаму з найважнейшых перыядаў у мінулым Цэнтральна-Усходняй Эўропы. У той час па ўсходніх абшарах беларускіх земляў прайшлася жудасная вайна. Іван Грозны захапіў Полаччыну. У той жа перыяд ствaралася новая дзяржава — Рэч Паспалітая, а таксама канчаткова Масковіяй быў зьнішчаны Ноўгарад Вялікі.

Актуальнасьць дадзенай манаграфіі ў тым, што ў беларускай савецкай і цяперашняй афіцыёзнай і незалежнай гістарыяграфіях дагэтуль не паўстала самастойнае па зьмесце і форме акадэмічнае дасьледаваньне, якое б адпавядала сучаснаму ўзроўню гуманістыкі і было-б напісанае з нацыянальных пазіцый. Цяжка прыгадаць у нашай гістарыяграфіі манаграфічныя дасьледаваньні, прысьвечаныя вайсковай тэматыцы[1]. Кніга Андрэя Янушкевіча зьявілася вельмі своечасова. Аўтар выдатна валодае праблематыкай, зьвязанай з сацыяльна-эканамічным жыцьцём краіны ў другой палове XVI ст., цудоўна ведае крыніцазнаўчую і гістарыяграфічную базу. Манаграфія напісана прыгожай беларускай мовай, тэкст не перагружаны навуковымі ці навукападобнымі тэрмінамі. А. Янушкевіч сьвядома карыстаецца аўтэнтычнай тэрміналогіяй XVI ст., пры неабходнасьці тлумачачы асобныя выразы. Гэта робіць мову нарацыі больш пераканаўчай і сакавітай.

Кніга Андрэя Янушкевіча падзяляецца на чатыры разьдзелы, уводзіны і заключэньне, сьпіс крыніц (архіўных і друкаваных) і літаратуры, з дадаткам карты „Тэрыторыя паўночна-ўсходняй Беларусі падчас Інфлянцкай вайны 1558-1570 гг.”, складзенай Віктарам Цемушавым па матэрыялах аўтара манаграфіі. У кнізе разглядаюцца шматлікія і разнастайныя аспекты Інфлянцкай вайны 1558-1570 гг.: вайсковы, дыпламатычны, мабілізацыйны, фінансава-матэрыяльны, сацыльна-палітычны, дэмаграфічны. Аўтару ўвесь час прыходзілася змагацца з устойлівымі стэрэатыпамі, якія склаліся дзесяцігодзьдзямі ў стаўленьні да Інфлянцкай вайны, яе прычын і наступстваў. Ён рашуча разбурае старыя савецкія і польскія погляды на той ці іншы аспект вайны, пасьлядоўна падыходзячы да іх асьвятленьня з нацыянальных і дзяржаўных пазіцый. Малады дасьледчык не абцяжарвае сябе ўспрыняцьцем ранейшых канцэпцый, а ствaрае

[1] Выключэньне — кніга Генадзя Сагановіча *Невядомая вайна 1654-1667 гг.* (Мінск 1995). Таму беларускія гісторыкі вымушаныя карыстацца дасьледаваньнямі польскіх альбо расейскіх калегаў.

ўласную новую канцэпцыю ўдзелу ВКЛ у гэтай вайне, свабодна і аб'ектыўна аперуючы матэрыялам. Для яго крытэрыем аналізу заўсёды зьяўляюцца інтарэсы Вялікага Княства Літоўскага.

Ужо ва „Уводзінах" аўтар ставіць шэраг важных метадалагічных і гістарыясофскіх пытаньняў, заяўляе сваю пазіцыю. Першая прапанова — тэрміналагічная: называць войны ВКЛ з Масковіяй у другой палове XVI ст. „Інфлянцкімі". А. Янушкевіч рашуча адмаўляе ўжываньне ў беларускамоўнай навуковай лексыцы тэрміна „Лівонская вайна", які запазычаны з рускай моўнай традыцыі і бездыскусыйна прыняты беларускімі савецкімі гісторыкамі. На самой справе ў крыніцах і дакументах, напісаных у XVI ст. на старабеларускай мове, не існуе „Лівоніі", а толькі „Інфлянты", „Ліфлянты", „землі пана Містра Ліфлянтского, земля і паньство Ліфлянтскіе" (з акта дэмаркацыі ў 1542 г.), мяжа паміж ВКЛ і „Ліфлянтскай/Інфлянскай канфедэрацыяй"[2]. Поўнасцю падзяляем погляд Андрэя Янушкевіча, што менавіта „старабеларуская мова павінна стаць асновай для выпрацоўкі сучаснай навуковай тэрміналогіі па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага" (с. 6). Тое ж самае тычыцца этнічных і дзяржаўна-палітычных назваў тагачаснай эпохі. Назвы „Літва" і „Русь" адносна тэрыторыі сучаснай Беларусі ў межах ВКЛ павінны стаць нормай у гістарычных дасьледаваньнях айчынных навукоўцаў, як гэта было ў штодзённым жыцьці нашых продкаў ад XIV да XVIII стст.[3]

Другая важная тэарэтычная прапанова — храналагічнага характару. Аўтар абгрунтавана адкідвае ранейшую перыядызацыю Інфлянцкай вайны, паводле якой яна цягнулася з 1558 да 1582 г. Для савецкай і сучасных афіцыйных расейскай і беларускай гістарыяграфій „гэта цалкам слушны падыход пры разглядзе гэтай падзеі ў кантэксьце гісторыі Расіі, для якой вайна была пэўным завершаным этапам у змаганьні за прыбалтыйскія тэрыторыі і выхад да Балтыйскага мора" (с. 5). Але калі ў цэнтры вывучэньня паставіць ВКЛ дык вышэйназваныя даты выклікаюць пярэчаньні і не адпавядаюць сапраўднасьці, бо „палітыка гэтай дзяржавы ў дачыненьні да прыбалтыйскіх зямель мела зусім іншы сутнасны характар. Для Княства „інфлянцкае пытаньне" ў 1582 г. яшчэ не было вырашана канчаткова. Скончыўся толькі пэўны этап у барацьбе за прыбалтыйскія тэрыторыі. На пачатку XVII ст. Рэч Паспалітая ўдзельнічала яшчэ ў дзьвюх войнах за Інфлянты, у якіх асноўным праціўнікам выступала Швецыя" (с. 5). Так званая Першая Інфлянцкая вайна паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай пачалася ў 1558 г. з моманту адкрытых вайско-

[2] *Метрыка Вялікага княства Літоўскага: Кніга 560 (1542 год): Кніга перапісаў № 3 (копія канца XVI ст.)*, падрыхтаваў А. І. Дзярновіч, Мінск 2007.

[3] Шырэй на гэтую тэму піша ў апошняй сваёй кнізе Алег Латышонак: *Od Rusinów białych do Białorusinów (u źródeł białoruskiej idei narodowej)*, Białystok 2006.

вых дзеяньняў апошняй на тэрыторыі Інфлянтаў, а скончылася ў 1570 г. падпісаньнем перамір'я на тры гады. Таму назва манаграфіі Андрэя Янушкевіча спалучае ў сабе сапраўдны суб'ект дасьледаваньня — Вялікае Княства Літоўскае, правільны аб'ект — Першая Інфлянцкая вайна, і дакладныя храналагічныя межы — 1558-1570 гг.

Раздзел I — *Ваенныя дзеяньні і дыпламатычныя зносіны паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай* — прысьвечаны аналізу інфлянцкай палітыкі ВКЛ на пачатку вайны і ваенных дзеяньняў паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай у 60-х гадох XVI ст., а таксама дыпламатычным адносінам у перыяд вайны. Разьдзел аб'ектыўна шмат у чым носіць кампілятыўны характар, бо ход вайсковых падзей дастаткова адлюстраваны як у наратыўных, у тым ліку эпісталярных крыніцах XVI ст. (польскіх хроніках М. Стрыйкоўскага, А. Гвагніна, Б. Папроцкага, Я. Бельскага і інш., маскоўскім летапісаньні, рэляцыях замежных дыпламатаў і падарожнікаў), так і ў навуковых манаграфіях XIX-XX стст. Праўда, аўтарская індывідуальнасьць і навуковая самастойнасьць пераважаюць, асабліва пры аналізе пэўных агульнавядомых фактаў і падзеяў.

Напрыклад, падрабязна паказана Полацкая катастрофа 1563 г. Сітуацыя, якая склалася вакол абароны і захопу Полацка ў лютым 1563 г. набывае ў нашыя дні палітычную афарбоўку. Маскоўскі гісторык Дзьмітры Валадзіхін спрабуе знайсьці сярод жыхароў Полацка падчас аблогі горада ў 1563 г. „прамаскоўскую партыю", а таксама рэабілітаваць маскоўскага цара. Маўляў, ніякіх арганізаваных Іванам Грозным масавых забойстваў не было, а калі і былі адзінкавыя забойствы, дык яны былі натуральным наступствам ваеннага становішча[4]. А. Янушкевіч сьцьвярджае: «Наўрад ці ў самым Полацку была нейкая ўплывовая „прамаскоўская партыя". (...) Крыніцы сьведчаць, што адзінай групай полацкага насельніцтва, якая вітала прыход маскоўцаў, сталі праваслаўныя сьвятары» (с. 66). Не была добразычлівай, мяккай і салідарнай палітыка Івана IV у дачыненьні да насельніцтва Полацка і Полацкага ваяводства. На падставе іншаземных крыніц аўтар падае лічбу ў 50-60 тыс. чалавек, якіх прымусова дэпартавалі з Полаччыны ў глыб Маскоўскай дзяржавы. Пры гэтым „дакладна вядома, што дэпартаваліся мяшчане, якія ў сваёй большасьці былі праваслаўнымі «русінамі»" (с. 69).

У кнізе А. Янушкевіча прадстаўлена першае ў беларускай гістарыяграфіі грунтоўнае вывучэньне пераможнай для ВКЛ бітвы пад Улай у лютым 1564 г. Перамога пад Улай даволі каларытна апісана і глыбока прааналізавана ў літаратуры. Гэта дазволіла аўтару рэцэнзаванай кнігі прыйсьці да цікавых высноў і арыгінальных меркаваньняў. Па-першае,

[4] Д. Н. Александров, Д. М. Володихин, *Борьба за Полоцк между Литвою и Русью в XII-XVI вв.*, Москва 1994, с.100-101, 106.

перамога над маскоўцамі была атрымана сваімі ўласнымі ліцьвінскімі сіламі без дапамогі палякаў, што адразу было выкарыстана ў выдатна праведзенай літоўскім бокам прапагандзе. Па-другое, сьведчаньнем бліскучай перамогі над непрыяцелем былі пагібель галоўнакамандуючага полацкай групоўкі маскоўскага войска князя Пятра Шуйскага, зьнішчэньне і захоп у палон іншых военачальнікаў, а таксама страта маскоўцамі вялікага абозу. Дарэчы, ваяводу П. Шуйскага, па некаторых звестках, забіў сякерай селянін з бліжэйшай вёскі, а цела знайшлі праз некалькі дзён у студні (с. 85). Па-трэцяе, перамога ва Ульскай бітве — гэта вынік добрай стратэгічна-тактычнай падрыхтоўкі камандуючага складу войска ВКЛ, на чале з найвышэйшым гетманам Мікалаем Радзівілам Рудым (які, насамрэч, не адыграў вялікай ролі непасрэдна ў бітве), у склад якога ўваходзілі таксама польны гетман Рыгор Хадкевіч, земскі стольнік Ян Хадкевіч, рагачоўскі староста Багдан Саламярэцкі, жытомірскі староста Раман Сангушка, луцкі староста Богуш Карэцкі, браслаўскі староста Юры Осцік, асцёрскі дзяржаўца Філон Кміта[5]. І апошняе, бітва і перамога пад Улаю ў лютым 1564 г. мела пэўнае псіхалагічнае значэньне, бо з гэтага часу маскоўцы не наважваліся болейісьці ў глыб тэрыторыі ВКЛ і ўступаць у адкрыты бой вялікімі сіламі аж да сярэдзіны XVII ст. „А так москаль сидел тихо от того часу”, — чытаем у *Хроніцы літоўскай і жмойцкай*.

І сапраўды, на працягу 1564-1570 гг. крыніцы паведамляюць нам пра перманентную вайну на зьнясіленьне паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай на тэрыторыі Полаччыны і суседніх раёнаў. Гэтым падзеям прысьвечаны 4 параграф першага разьдзелу кнігі А. Янушкевіча. Аўтару ўдалося паказаць пасьпяховыя вайсковыя акцыі з боку ВКЛ: на пачатку сакавіка 1565 г. быў зьдзейсьнены ўдалы рэйд польскай коннай групоўкі па тэрыторыі Пскоўскай зямлі; 20 ліпеня 1567 г. — бітва ў ваколіцах возера Суша на поўдзень ад Полацка, дзе было разгромленае вялікае маскоўскае войска; 20 жніўня 1568 г. „адбылася адна з найбольш значных падзей Інфлянцкай вайны” (с. 107): найманае войска ВКЛ захапіла добраўмацаваны замак Ула, пабудаваны маскоўцамі ў 1566 годзе; 11 студзеня 1569 г. літоўскі атрад колькасьцю 800 чалавек на чале з братамі Палубенскімі зьдзейсьніў напад і захапіў замак Ізборск на мяжы Пскоўскай зямлі і Інфлянтаў. Адной з заслуг аўтара манаграфіі

[5] Вядомы пазьней як Філон Кміта-Чарнабыльскі аўтар знакамітых лістоў з 70-х гадоў XVI ст. Сярод іх — перапіска аршанскага старасты Ф. Кміты з Астафіем Валовічам і іншымі высокімі ўраднікамі ВКЛ адносна яго тайнай выведачнай службы, якая была часткова апублікавана ў XIX ст. М. Маліноўскім, перадрукавана ў 1975 г. на Беларусі, а часткова знаходзіцца ў AGAD. Грунтоўны аналіз гэтай перапіскі мог бы дадаць істотныя моманты да высьвятленьня ўнутранай і знешнепалітычнай сітуацыі ў ВКЛ падчас Інфлянцкай вайны.

зьяўляецца і тое, што ён выдатна паказаў вялікую ролю, якую адыгралі ў Інфлянцкай вайне такія гістарычныя асобы, як Геранім і Ян Хадкевічы, Раман Сангушка, Філон Кміта і інш. — славутыя героі беларускага народу. А. Янушкевіч прадэманстраваў сапраўдныя стратэгічныя здольнасьці, апісваючы, як разьвіваліся падзеі на розных франтах — у Інфлянтах і на літоўска-маскоўскім памежжы.

А зь іншага боку, „адчувальнае паражэньне ліцьвінаў" 6 лістапада 1564 года, калі маскоўскае войска на чале з казанскім царом Сімяонам, Іванам Пронскім і Васілём Сярэбраным захапіла і зьнішчыла замак і мястэчка Азярышча. „Захоп Азярышчаў быў асабліва прыкрым на фоне бліскучай перамогі пад Улай на пачатку года. Гэтая падзея засьведчыла здранцьвелы стан абарончай сістэмы Княства, яе няздольнасьць аператыўна рэагаваць на раптоўныя дзеяньні праціўніка" (с. 95). Аўтар кнігі прыходзіць да высновы, што ваенныя дзеяньні паказалі бясспрэчную перавагу войска ВКЛ у адкрытым змаганьні. З адваротнага боку, ліцьвіны саступалі маскоўцам у правядзеньні аблогавых аперацый. Такі стан рэчаў спрычыніўся да значных тэрытарыяльных страт ВКЛ на Полаччыне (с. 116). Нельга не зьвярнуць увагі на тое, што аўтар, паказаўшы добра час будаўніцтва і лакалізацыю маскоўскіх абарончых пунктаў на Полаччыне, пакінуў па-за ўвагай іх фартыфікацыйныя характарыстыкі. Тым больш, што існуе адпаведная літаратура на дадзеную тэму[6].

Першая Інфлянцкая вайна паміж Вялікім Княствам Літоўскім (з 1569 г. — Рэччу Паспалітай) і Вялікім Княствам Маскоўскім скончылася падпісаньнем мірнага пагадненьня, якое пачынала дзейнічаць з 18 чэрвеня 1570 г. і прадугледжвала перамір'е на тры гады, захаваньне актуальных на той час пазіцый абодвух бакоў на Полаччыне і адсутнасьц дакладных межаў у Інфлянтах. Гэта значыць, што ў руках маскоўцаў заставаліся вялікая тэрыторыя Полаччыны і значная частка Інфлянтаў разам з Нарвай і Дэрптам. Трэба пагадзіцца з думкай Андрэя Янушкевіча, што „пераможцу ў Інфлянцкай вайне 1558-1570 гг. нельга вызначыць. Было відавочна, што перамір'е носіць кароткачасовы характар і барацьба на гэтым ня скончыцца. Усё залежала ад таго, ці змогуць варожыя бакі мабілізаваць сілы і выкарыстаць у сваіх інтарэсах спрыяльныя знешнія і ўнутраныя фактары" (с. 116). Як паказала будучыня, рэванш за ваенныя паражэньні ажыцьцявіла Вялікае Княства Літоўскае, аб'яднанае ў 1569 г. у адну дзяржаву з Польскай Каронай.

Разьдзел II — *Арганізацыя ўзброенных сіл ВКЛ* — прысьвечаны аналізу галоўнай сацыяльнай групы кожнай сярэднявечнай дзяржавы —

[6] А. Сапунов, *Рисунки крепостей, построенных по велению царя Ивана Васильевича Грозного после завоевания Полоцка в 1563 году*, [у:] *Полоцко-Витебская старина*, Витебск 1912, вып. 2; Б. Брэжго, *Замкі Віцебшчыны*, Вільня 1933.

войску. Андрэй Янушкевіч разглядае асноўныя структурныя адзінкі ўзброеных сілаў ВКЛ падчас Першай Інфлянцкай вайны: мясцовае шляхецкае паспалітае рушэньне і найманае войска, сярод якога асобна вылучае польскі найманы кантынгент.

І тут аўтар манаграфіі акцэнтуе ўвагу на момантах, якія раней заставаліся недаацэненыя дасьледчыкамі. Так, ён паказвае, што сітуацыя ў 1563-1565 гг. у ВКЛ падчас Інфлянцкай вайны была настолькі складаная, што абараняць яго мусілі нават сяляне (рэдкі выпадак у жыцьці феадальнай дзяржавы), рамесьнікі і путныя баяры (с. 132-133,136), а таксама прадстаўнікі насельніцтва прыватнаўласьніцкіх гарадоў і нават дарослыя цыганы (с. 146). У разьдзеле вызначаюцца прычыны дрэннага збору паспалітага рушэньня. Сярэдняя і дробная шляхта (аснова паспалітага рушэньня) была прывязана да маёнткаў і гаспадаркі значна больш моцна, чым рыцарскае саслоўе ў ранейшыя перыяды. У дачыненьні да дробнай шляхты прымаліся штрафныя санкцыі (канфіскацыя маёнтка), што прымушала шляхцічаў удзельнічаць у паспалітым рушэньні. І тым самым А. Янушкевіч лічыць няслушнымі меркаваньні некаторых сучасных дасьледчыкаў пра сьвядомы сабатаж паспалітага рушэньня з боку шляхты. Магнаты карысталіся значнейшымі вольнасьцямі ў выстаўленьні войска: маглі не падаваць рэестры землеўладаньняў для вызначэньня колькасьці жаўнераў, не плаціць падаткі. Тым ня менш, як адзначае А. Янушкевіч, яны добраахвотна выстаўлялі дадатковыя кантынгенты жаўнераў, напрыклад, у 1567 г. каля 15% ад усёй коньніцы складалі дадатковыя магнацкія вершнікі. Адзначаецца, што ў паспалітым рушэньні 1567 г. пад Маладзечнам сабралася найбольш вершнікаў за ўсё XVI ст. — 27 597 асобаў. Так што мабілізацыйныя і арганізацыйныя высілкі дзяржаўных структур у 1567 годзе прынесьлі свой плён, што, дарэчы, застрашыла праціўніка.

Аднак высновы А. Янушкевіча песімістычныя, і ён, як і ўсе мы сёньня, перажывае цяжкую і трагічную сітуацыю таго часу вельмі эмацыйна: „паспалітае рушэньне падчас Інфлянцкай вайны 1558-1570 гг. хоць і пацьвердзіла свой статус асноўнай ваеннай сілы ў ВКЛ, аднак так і не здолела забясьпечыць перамогу ў ваенных дзеяньнях. Шляхецкае апалчэньне зьяўлялася маларухомай структурай, няздатнай аператыўна рэагаваць на сітуацыю на ваенным фронце. Выклікала пытаньні баяздольнасьці шляхціцаў, якія за доўгі час папросту развучыліся ваяваць. Зборам паспалітага рушэньня пастаянна спадарожнічалі такія праблемы, як ухіленьне ад службы, укрываньне сапраўдных памераў почтаў, гвалт з боку жаўнераў і інш.” (с. 156). Таму аўтар вельмі трапна назваў паспалітае рушэньне ВКЛ падчас Першай Інфлянцкай вайны „крызісам магчымасьцей”.

У часы Інфлянцкай вайны ў войску ВКЛ актыўна выкарыстоўваецца новы элемент — найманае войска. Крыніцам асобавага складу, структуры, забесьпячэньню і дзейнасьці найманых кантынгентаў Андрэй Янушкевіч прысьвячае другі і трэці параграфы 2 разьдзела сваёй манаграфіі. Дадзеная тэма слаба распрацаваная ў беларускай гістарыяграфіі[7]. Падчас вайны 1558-1570 гг. гэты кантынгент войска ВКЛ складаўся з мясцовых прадстаўнікоў і польскіх жаўнераў. Традыцыйна найманае войска падзялялася на роты коньнікаў і драбаў. Да складу найманага войска аўтар залічвае таксама казацкія атрады. А. Янушкевіч перакананы, што для перыяду Інфлянцкай вайны (сярэдзіны XVI ст.) казакі „ня толькі ўкраінская зьява". На пытаньне: „Хто-ж такія казакі?" — А. Янушкевіч адказвае, што „ў дадзены перыяд казакі сталі звычайным элементам аховы на ўсіх памежных тэрыторыях ВКЛ, якія знаходзіліся ў бесперапынным прадчуваньні альбо стане вайны (...). Гэта асобы нешляхецкага паходжаньня, якія мелі досьвед ваеннай службы, але ў мірны час займаліся сельскай гаспадаркай альбо рамеснай вытворчасьцю. Гэта своеасаблівы пераходны тып паміж мірным селянінам і ваеннаабавязаным служэбнікам, які па першым закліку ўладаў быў гатовы ўзяцца за зброю" (с. 170-171). „Казакі ВКЛ", а можа нават „беларускія казакі" — вось яшчэ адна цікавая і актуальная тэма навуковага дасьледваньня для ўласна беларускай гістарычнай навукі. Ментальнасьць сучаснага беларуса атаясамлівае „казака" толькі з Запарожскай Сеччу, паўстаньнем Багдана Хмяльніцкага, суб'ектыўна апісанага Генрыхам Сянкевічам, „нацыянальна-вызваленчымі дзеяньнямі" атрадаў Севярына Налівайкі, гогалеўскімі „Вечарамі на хутары паблізу Дзеканькі" і шолахаўскім „Ціхім Донам".

Трэці параграф другога разьдзела сваёй манаграфіі Андрэй Янушкевіч прысьвяціў характарыстыцы і ролі польскага найманага кантынгента падчас Першай Інфлянцкай вайны 1558-1570 гг. У гэты перыяд польскія жаўнеры вылучаліся выдатнымі баявымі якасьцямі і добрай падрыхтоўкай. Таму вялікі князь літоўскі Жыгімонт Аўгуст не без падстаў разьлічваў зь іх дапамогай павялічыць ваенны патэнцыял ВКЛ у вайне з Масквой. Аднак глыбокі аналіз наяўных крыніцаў дазволіў Андрэю Янушкевічу разьвеяць даволі даўні міф польскай гістарыяграфіі аб тым, што польскае найманае войска адыграла вырашальную ролю ў вайне 1558-1570 гг. (L. Kolankowski, H. Lulewicz, M. Plewczyński). Андрэй Янушкевіч таксама сьмела паказвае колькасную неадпаведнасьць польскіх жаўнераў у працах польскіх гісторыкаў (Мар'ян Пляў-

[7] Нам вядомы толькі дзьве бібліяграфічныя пазіцыі: Ю. М. Бохан, *Наёмнае войска ў Вялікім княстве Літоўскім у XV-XVI стст.* (Мінск 2004) і старонкі ў навукова-папулярнай кнізе Генадзя Сагановіча *Войска Вялікага Княства Літоўскага ў XVI-XVII стст.* (Мінск 1994).

чыньскі) захаваным крыніцам. Колькасць польскіх найманаў увесь час вагалася ў залежнасьці ад фінансавых і харчовых магчымасьцяў ВКЛ ад 1 130 коньнікаў і 1 970 драбаў зімой 1563/1564 г. да 7 200 коньнікаў і 30 ротаў драбаў у 1565 г.[8] Таму дзейнасьць польскага найманага войска аўтар арыгінальна ахарактарызаваў як „ілюзію дапамогі ці невыкарыстаныя магчымасьці". „Польскае войска адыграла хоць важную, але далёка не вырашальную ролю ў абароне ВКЛ і Інфлянтаў ад маскоўскага непрыяцеля. Зламаць ход падзей у вайне яно не магло з прычыны пэўных аб'ектыўных абставін, яго прысутнасьць на тэрыторыі ВКЛ нярэдка станавілася фактарам унутранай нестабільнасьці" (с. 210).

У падмацаваньне сваёй пазіцыі А. Янушкевіч прыводзіць шэраг пераканаўчых аргументаў. Польскія жаўнеры непрыязна ставіліся да жыхароў ВКЛ і гэта адбівалася на двухбаковых зносінах. Менавіта польскі бок падчас Інфлянцкай вайны першы паставіў эфекты вайсковай дапамогі ў залежнасьць ад перспектыў польска-літоўскіх палітычных узаемадачыненьняў. Не прызналі ў паляках „сваіх" і ставіліся да іх без добразычлівасьці магнаты, шляхта і простае насельніцтва ВКЛ. Для сялянаў і мяшчанаў польскія найміты асацыяваліся з гвалтамі і спусташэньнямі, што асабліва моцна праявілася ў 1565 г. Дарэчы, злачынствы польскіх жаўнераў у гэты год былі настолькі маштабнымі, што наступствы разглядаліся на Віленскім сойме 1565/1566 г., а рэха падзей адлюстравалася ва ўхвалах соймаў 1566/1567 і 1568 гг.

Польскія роты катэгарычна адмаўляліся падпарадкоўвацца вайсковаму камандаваньню ВКЛ і даволі часта дзейнічалі без узгодненасьці з апошнім і праяўлялі ўласную ініцыятыву ў пошуках праціўніка. Напрыклад, у 1565 г. зьдзейсьнілі рэйд па Пскоўшчыне. Праўда, і прадстаўнікі кіруючых колаў ВКЛ ацэньвалі дзейнасьць польскага вайсковага кантынгента ў Інфлянтах і ва ўсходніх рэгіёнах ВКЛ скептычна і негатыўна. Асабліва катэгарычнай была пазіцыя Радзівілаў і Хадкевічаў. За ўвесь час Інфлянцкай вайны 1558-1570 гг. найбольш гучнай ваеннай падзеяй з удзелам польскага войска была Невельская бітва ў жніўні 1562 г. А адзіная супольная польска-ліцьвінская акцыя — гэта безвыніковая выправа на Полацк летам 1564 г. У 1566 г. асобны польскі найманы кантынгент фактычна перастаў існаваць, а ў наступным годзе польскі сойм спыніў фінансаваньне на ваенныя патрэбы, убачыўшы ўпартае нежаданьне ліцьвінаў ісьці на заключэньне ўніі. Польскае войска як асобная структурная адзінка канчаткова перастае згадвацца.

[8] Мар'ян Пляўчыньскі, напрыклад, падае, што колькасць жаўнераў у конных ротах складала каля 7 700, а ў драбскіх — каля 8 700 на сярэдзіну 1563 г.; 8 800 коньнікаў і 4 500 драбаў у верасні 1564 г.; 14 700 чалавек у 1566 г. Гл.: M. Plewczyński, *Materiały do zagadnienia liczebności i organizacji wojska polskiego w latach 1506-1573*, [w:] *Studia i Materiały do Historii Wojskowości*, 1990, t. 33, s. 329-330.

З гэтага часу кіраўніцтва ВКЛ звяртаецца да фарміраваньня найманага кантынгента пераважна за кошт мясцовых людскіх і матэрыяльных рэсурсаў.

З-за перманентнага недахопу грашовых сродкаў і харчаваньня даволі часта складвалася крызісныя сітуацыя, якую найміты спрабавалі вырашаць шляхам рабаваньня мірнага насельніцтва, адкрыта выкарыстоўваючы зброю. Падобныя дзеяньні стваралі дзяржаве дадатковыя праблемы і выклікалі „галаўны боль для ўладаў" — так А. Янушкевіч назваў другі параграф трэцяга разьдзела сваёй кнігі. Праўда, адмовіцца ад найманага войска ўжо не было ніякай магчымасьці. Бо толькі яно больш-меньш эфектыўна спрабавала закрываць прарэхі ў сістэме абароны на ўсходзе ВКЛ і зьяўлялася адзіным незаменным рэсурсам стабільнага і прафесійнага забесьпячэньня абароны.

Нельга абысьці ўвагай выснову аўтара пра Інфлянцкую вайну як пераломны момант у арганізацыі ваеннай справы ВКЛ. Маецца на ўвазе сутыкненьне сярэднявечнай традыцыі, якая трымалася на выкарыстаньні „паспалітага рушэньня" — усеагульнага шляхецкага апалчэньня, з навацыйнай тэндэнцыяй эпохі Рэнесансу, якая палягала на пераважным выкарыстаньні прафесійных найманых жаўнераў. У гэтым мы бачым пачаткі прафесіяналізацыі арміі ВКЛ. Аналізуючы „попісы" паспалітага рушэньня 1565 і 1567 гг., іншыя сьпісы ротаў за гэтыя часы, якія знаходзяцца ў Літоўскай Метрыцы, разглядаючы пастановы Гарадзенскага сойму 1566-67 гг. адносна ўзмацненьня абарончай здольнасьці краю і мабілізацыі сродкаў, А. Янушкевіч прыходзіць да высновы, што шляхта сама была зацікаўленая ў замене паспалітага рушэньня больш мабільным найманым войскам, але для гэтага патрэбныя былі карэнныя зьмены ў дзяржаўнай палітыцы. Той факт, што паспалітае рушэньне як неад'емны элемент старой ваенна-феадальнай сістэмы ўжо страціла сваё значэньне, а найманае войска яшчэ не магло поўнасьцю яго замяніць, адзначаецца аўтарам манаграфіі як падставовая прычына няўдач Вялікага Княства Літоўскага ў першай Інфлянцкай кампаніі.

Разьдзел III — *Фінансава-матэрыяльнае забесьпячэньне ўдзелу ВКЛ у Інфлянцкай вайне* — прысьвечаны пытаньням гаспадарчага патэнцыялу ВКЛ у сярэдзіне XVI ст. і магчымасьцям дзяржавы акумуляваць неабходныя сродкі для вядзеньня вайны. У першым параграфе разглядаецца сістэма збору падаткаў у ВКЛ. Шляхта і духавенства як непадатныя саслоўі былі вызваленыя ад выплаты сталых падаткаў. Іх цяжар клаўся на непрывілеяваныя станы — мяшчанства і сялянства. Шляхта плаціла толькі надзвычайныя падаткі з маёнткаў (серабшчыну і пагалоўшчыну) на ваенна-абарончыя мэты і абавязана была служыць у паспалітым рушэньні. А. Янушкевіч разглядае пастановы соймаў 1559, 1563, 1565, 1566 і 1568 гг., а таксама магнацкіх і шляхецкіх зьездаў

з пункту гледжаньня мабілізацыйна-абарончых мерапрыемстваў. Да гэтых мерапрыемстваў належалі: „увязанье” — прымусовы перавод маёнткаў шляхты ў карыстаньне дзяржавы; „децкованье” — спагнаньне грашовых штрафаў за спазьненьне выплат; забарона экспарту харчовых прадуктаў ад 12.08.1563 г.; прымусовыя займы з гарадоў („позычкі” рабіліся кожныя 2 гады, пачынаючы з 1561 г.); „заставы” дзяржаўных маёнткаў прыватным асобам на кароткі тэрмін з мэтай павышэньня іх даходнасьці; падаткі з гандлёвых аперацый і мытныя пошліны; падаткі з жыдоўскага насельніцтва. Аўтар манаграфіі прыходзіць да высноваў, што нягледзячы на шматлікія і разнастайныя, абавязковыя і неабавязковыя ініцыятывы і мерапрыемствы, якія прадпрымала дзяржаўная ўлада ВКЛ, для напаўненьня скарбу фінансавымі сродкамі, фінансава-гаспадарчых рэсурсаў было недастаткова для вядзеньня актыўнай наступальнай вайны і арганізацыі абароны межаў.

Вельмі падрабязна разглядаецца механізм збору падаткаў і прычыны цяжкага фінансавага становішча краіны. У гэтым жа разьдзеле падлічана, у колькі абыходзіліся ў сярэднім у год найманыя коньнікі і драбы. З-за недахопу дзяржаўных сродкаў частка ротмістраў і гетманы Ян Хадкевіч і Раман Сангушка аплочвалі жаўнераў таксама з уласнай кішэні. Першы, па падліках А. Янушкевіча, за 1565-1567 гг. выдаў на гэта 34 083 копы грошаў, а Р. Сангушка — 3 000 коп грошаў і прыняў на сябе ў 1568 г. першачарговыя расходы па аднаўленьні ўмацаваньняў Ульскага замка і фармаваньні ў крэпасьці гарнізона (с. 268).

Разьдзел IV — *Уплыў ваеннага становішча на разьвіццё унутрыпалітычных працэссаў у ВКЛ* — прысьвечаны складаным пытаньням антрапалагічнага і ментальнага характару, як стаўленьне да Інфлянцкай вайны эліт, шляхты і насельнітцва памежных з Маскоўскім царствам тэрыторый, уплыў вайны на заключэньне ўніі з Польшчай, укараненьне „шляхецкай дэмакратыі”, дэмаграфічнай сітуацыі на акупаваных землях і ўзаемадзеяньне насельніцтва з акупантамі.

Зыходзячы з пазіцый, што Інфлянцкая вайна для ВКЛ адкрывала не толькі новую старонку ў яго зьнешняй палітыцы, але і моцна паўплывала на зьмест унутрыпалітычных працэсаў, Андрэй Янушкевіч сьмела ставіць побач з агульнавядомымі новыя пытаньні. Аўтар згаджаецца, што страта Полацка зімой 1563 г. моцна паўплывала на канчатковае ўсьведамленьне кіраўніцтвам ВКЛ неабходнасьці больш моцнага збліжэньня з Каронай Польскай дзеля эфектыўнай дапамогі з боку апошняй. Аднак сваю ўвагу А. Янушкевіч засяроджвае на праблеме паглыбленьня расколу палітычнай прасторы ВКЛ у гэты час і пошукаў шляхоў і механізмаў з боку ўладаў для кансалідацыі грамадства. Дзеля забесьпячэньня цьвёрдай падтрымкі насельнітцва ўсходніх тэрыторый ВКЛ, пераважна праваслаўнага веравызнаньня, на Віленскім сойме

1563 г. быў прыняты прывілей аб ураўнаваньні ў палітычных правах хрысьціян усіх канфесій. Гэта азначала кансалідацыю шляхецкага грамадства на станавой аснове без канфесійных адрозьненьняў. На думку А. Янушкевіча зьяўленьне прывілею „выклікана ў першую чаргу сур'ёзнымі зьнешнепалітычнымі ўскладненьнямі (...) і павінна было паспрыяць умацаваньню салідарнасьці шляхецкага стану, на якім ляжаў абавязак абароны краіны і трываласьці сацыяльных асноў дзяржавы, якая перажывала цяжкія часы" (с. 274-275). У гэтым месцы пазіцыя аўтара зноў кардынальна разыходзіцца з агульнапрынятым у польскай гістарыяграфіі меркаваньнем пра метанакіраваную палітыку гаспадарскай улады, скіраванай на стварэньне адпаведных спрыяльных варункаў для заключэньня будучай уніі (O. Halecki, K. Chodynicki, J. Pelecski, J. Bardach).

Андрэй Янушкевіч аргументавана паказаў, што доўгая адсутнасьць Жыгімонта II Аўгуста ў ВКЛ была зьвязана з пошукам неабходных рэсурсаў для пасьпяховага вядзеньня вайны і абароны Інфлянтаў і ўсходніх рэгіёнаў Княства. Бо гаспадар прытрымліваўся цьвёрдага меркаваньня, што ВКЛ самастойна не здольнае перамагчы ворага з-за яўнага недахопу сіл і сродкаў. Трэба пагадзіцца з А. Янушкевічам: „патрэба ў атрыманьні вайсковай і фінансава-матэрыяльнай падтрымкі ад Польскай Кароны для пасьпяховага ўдзелу ў Інфлянцкай вайне" зьявілася тым чыньнікам, які паўплываў на зьмены ў пазіцыі Жыгімонта Аўгуста, а „не досыць эфемерны ціск шляхты з патрабаваньнямі правядзеньня рэформаў" (с. 278-279). Маецца на ўвазе, што з 1562-1563 г. вялікі князь рашуча зьвярнуўся да пытаньня заключэньня новай уніі паміж ВКЛ і Польшчай і ажыцьцяўленьня зьвязаных з ёй шляхецка-дэмакратычных рэформаў. Дзеля гэтага на першыя ролі ў кіраўніцтве ВКЛ выходзіць Ян Хадкевіч, жамойцкі стараста, а з 1566 г. земскі маршалак. Гэты малады магнат карыстаўся вялікай папулярнасьцю сярод шляхты, бо ён адзін зь першых зразумеў вялікі палітычны патэнцыял шляхецкіх масаў. Вельмі падобныя погляды зь вялікім князем Ян Хадкевіч меў на ролю і значэньне шляхецка-дэмакратычных прынцыпаў дзяржаўнага ўладкаваньня ў адрозьненьні ад традыцыйнай пазіцыі роду Радзівілаў. На думку А. Янушкевіча, усё гэта зблізіла Жыгімонта II Аўгуста з Я. Хадкевічам настолькі, што менавіта яго гаспадар вызначыў на галоўнага выканаўцу новых пераўтварэньняў (даверыў яму вядзеньне спраў на вальных соймах пасьля правядзеньня ўніфікацыйных рэформаў), тым самым стварыўшы супрацьвагу Радзівілам. І зноў беларускі дасьледчык абгрунтавана абвяргае распаўсюджаны ў польскай гістарыяграфіі тэзіс (O. Halecki, H. Lulewicz) аб імкненьні Жыгімонта Аўгуста „перакупіць" Яна Хадкевіча, з мэтай схіліць яго на бок прыхільнікаў уніі (с. 284). Не пагаджаецца А. Янушкевіч з агульнапрынятымі меркаваньнямі і гістарыягрыфічнымі стэрэаты-

памі, што Я. Хадкевіч быў апалагетам уніі паміж ВКЛ і Польшчай і што ў сярэдзіне XVI ст. праходзіла вострая палітычная барацьба паміж родамі Радзівілаў і Хадкевічаў.

Не абмінуў аўтар рэцэнзаванай кнігі адну з найважнейшых праблем у гісторыі ВКЛ і Польшчы — Люблінскую унію 1569 г. Ён рашуча і абгрунтавана выступае супраць чарговага гістарыяграфічнага стэрэатыпу, што шляхта ВКЛ зьяўлялася сьвядомым правадніком і групай падтрымкі заключэньня новага саюзнага пагадненьня з Польшчай, што ўнія гарантавала прывілеяванаму стану ВКЛ атрыманьне „залатых правоў і вольнасьцей", якімі карысталася польская шляхта і што заключэньне ўніі знаменавала сабою перамогу „шляхецкай дэмакратыі", пры якой шляхта рабілася галоўнай палітычнай сілай. А. Янушкевіч прызнае, што Інфлянцкая вайна 1558-1570 гг. паспрыяла заключэньню Люблінскай уніі, аднак не абсалютызуе вайсковага фактару. У 60-я гады XVI ст. склаліся ўнутрыпалітычныя і сацыяльныя ўмовы для дзяржаўных пераўтварэньняў і, у прыватнасьці, для заключэньня ўніі. У кнізе разглядаюцца прычыны і этапы, як гэта адбывалася.

Пад Віцебскам у верасьні 1562 г. шляхта паспалітага рушэньня падала петыцыю гаспадару з просьбай аб уніі. Андрэй Янушкевіч паказвае, што сярод сярэдняй і дробнай шляхты не было палітычных лідэраў. На самой справе гэта магнат Ян Хадкевіч выкарыстаў пацыфісцкія настроі паспалітага рушэньня ў сваіх палітычных мэтах. Для зразуменьня палітычных праблем у ВКЛ напярэдадні Люблінскай уніі Янушкевіч прапануе разглядаць шляхту як палітычную сілу ў рамках паліталагічнай тэорыі „груп інтарэсаў", а не надаваць ёй рысы спецыфічнай палітычнай партыі. Ён прыходзіць да высновы, што шляхта не мела „палітычнай групоўкі", у якой павінны быць палітычная праграма, лідэр-рэпрэзентант і сродкі для рэалізацыі ідэй. Больш таго, структура ўлады ў ВКЛ была пабудавана такім чынам, што найбольш здольныя шляхціцы пераходзілі на службу на гаспадарскі альбо магнацкі двор і зь цягам часу маглі ўвайсьці ў шэрагі найвышэйшых ураднікаў, што ў сваю чаргу адкрывала шлях да набыцьця магнацкага статусу. Мусім пагадзіцца з высновай аўтара, што „шляхецкая дэмакратыя" ў рэаліях палітычнага жыцьця заўсёды насіла досыць фармальны характар. І пасьля рэформ 1563-1566 гг. сярэдняя шляхта знаходзілася пад уплывам магнатаў, толькі цяпер гэта была пераважна непрыхаваная залежнасьць кліента ад патрона. „(...) шляхецкі стан (...) не гледзячы на сваю істотную ролю, заставаўся фактычна аб'ектам узьдзеяньня з боку гаспадара і радных паноў, якія трымалі ў сваіх руках галоўныя ніці кантролю над палітычным жыцьцём у ВКЛ" (с. 297).

Інфлянцкая вайна стала важнай перадумовай імклівага росту палітычнага значэньня шляхецкага стану. Безумоўна шляхта разлічвала ат-

рымаць карысьць ад уніі з Польшчай. Аднак А. Янушкевіч лічыць, што больш пільнай патрэбай для яе было прыняцьце новага Статуту, у які былі-б упісаны прывілеі аб наданьні шляхецкіх правоў і вольнасьцяў. Пасля зацьвярджэньня і ўступленьня ў сілу Статута ВКЛ 1566 г., адзначае аўтар, шляхта дамаглася рэалізацыі сваіх планаў. Атрыманьне шляхецкіх вольнасьцяў ужо не магло быць прывабным аргументам на карысьць уніі з Польшчай. А. Янушкевіч падкрэслівае, што пасля заключэньня перамір'я з Маскоўскай дзяржавай адпаў-бы галоўны аргумент для ўніі. Такім чынам, робіцца зразумелым, чаму літоўскія радныя паны ўвесь час выступалі з перамірнымі ініцыятывамі: гэта было адзінай рэальнай магчымасьцю адцягнуць заключэньне ўніі з Польшчай. Дарэчы, мэтанакіраванае і пасьлядоўнае імкненьне да ўніі назіралася толькі ў асяроддзі падляшскай шляхты.

Андрэй Янушкевіч закранае ў сваёй кнізе і пытаньні патрыятызму. Аўтар адзначае, што для шляхты не былі чужымі агульнадзяржаўныя інтарэсы ВКЛ. „Літвінаў вызначала цьвёрдае разуменьне ўласнага адрозьненьня ад тых-жа палякаў як асобнага „палітычнага народа". Усьведамленьне асобнасьці свайго палітычнага быцьця зьмешвалася з этнічнымі характарыстыкамі, у выніку чаго паўставала арыгінальная «літвінская сьвядомасьць»" (с. 302-303). Яскравым сьведчаньнем праяўленьня сваёй непадобнасьці да польскага народа зьяўляюцца шматлікія публіцыстычныя творы таго часу, напісаныя з абодвух бакоў. Асабліва творы Станіслава Ажахоўскага і ананімная *Размова Паляка з Літвінам*. Ініцыятарамі стварэньня *Размовы*, на думку Янушкевіча, былі Радзівілы, а зьмест адлюстроўваў пазіцыю магнатэрыі.

Урэшце зь вялікімі цяжкасьцямі, пэўнымі кампрамісамі з абодвух бакоў, у 1569 г. была заключана Люблінская ўнія. Да гэтага часу была канчаткова ўсьвядомлена ідэя неабходнасьці ўніі з Польшчай у асяродзьдзі шляхты ВКЛ. У першую чаргу яна дыктавалася амаль поўнай вычарпанасьцю ўнутраных рэсурсаў дзяржавы і няздольнасьцю самастойнага вядзеньня вайны з Масквой. Пасьпяховае завяршэньне ўнійнага працэсу, адзначае А. Янушкевіч, трэба таксама зьвязваць і з рашучасьцю на апошняй стадыі Жыгімонта II Аўгуста. І самае галоўнае, як лічыць аўтар „ні магнаты, ні шараговая шляхта не падтрымалі ідэю інкарпарацыйнай уніі, цьвёрда адстойваючы суверэнітэт краіны. Унія разглядалася перадусім як раўнапраўны саюз дзьвюх дзяржаў, неабходны для забесьпячэньня іх бясьпекі і правядзеньня ўзгодненай зьнешняй палітыкі" (с. 336).

Адным з вынікаў Першай Інфлянцкай вайны была акупацыя з 1563 г. Полаччыны маскоўскімі войскамі. Таму па-за ўвагай Андрэя Янушкевіча не маглі застацца пытаньні жыцьця мясцовага насельніцтва пад акупацыяй і іх узаемадачыненьні з маскоўцамі. І зноў трэба падкрэсь-

ліць, што гэта абсалютна новыя тэмы ў беларускай гістарыяграфіі. Аўтар паказаў сапраўдную палітыку маскоўцаў у захопленым Полацку, называючы яе „акупацыйным рэжымам” і на падставе шматлікіх фактаў з крыніц разьвеяў міф савецкай гістарыяграфіі пра „вызваленчую місію” маскоўскага войска. Маскоўскія ўлады ня бачылі ў полацкім праваслаўным людзе свайго натуральнага саюзьніка, а наадварот, як гэта ўласьціва акупантам, ставіліся да яго зь недаверам і падазронасьцю. Дэпартацыі і рэпрэсіі ад самага пачатку маскоўскага панаваньня засьведчылі, што новыя ўладары не зьбіраліся абапірацца на мясцовае праваслаўнае насельнітцва. Па загадзе Івана Грознага на Полаччыне дзейнічалі карна-застрашальныя экспедыцыі, непакорлівых казьнілі, людзі беглі з родных мясьцінаў. Дзеля ўласнай бясьпекі ў Полацку акупанты пабудавалі Ніжні замак, які адмежаваў маскоўцаў ад мясцовага насельнітва, якое выселілі ў Запалоцьце[9]. Вынікам ваеннага становішча стаўся сур’ёзны дэмаграфічны крызіс на Полаччыне ў 60-70-я гг. XVI ст. Колькасць населеных пунктаў не перавышала колькасці кінутых. Валочная-ж рэформа адбылася тут толькі ў XVII ст.

Жыхары Полаччыны, разумеючы гэта, ставіліся да чужынцаў адэкватна, пры спрыяльных абставінах нават аказвалі супраціўленьне. Пры ўсёй складанасьці сітуацыі ў паўночна-ўсходнім рэгіёне ВКЛ крыніцы не дазваляюць казаць пра масавыя прамаскоўскія настроі сярод мясцовага гарадскога і вясковага насельнітва. Прыпісваць сялянству жаданьне „далучыцца да Расіі” зьяўляецца некарэктным з сучаснага навуковага пункту гледжаньня. З іншага боку, А. Янушкевіч аб’ектыўна паказвае, што былі выпадкі і падпарадкаваньня Маскве, і адзінкавыя факты шпіёнства на яе карысьць.

**Альбіна Семянчук,**
**Генадзь Семянчук**
(Гродна)

[9] Падрабязней на дадзеную тэму гл.: С. Тарасаў, *Полацк IX-XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія*, Мінск 1998.